Алесь Гібок-Гібкоўскі



...тэрор гэта так, між іншым,
мэтай жа ўсялякай рэвалюцыі
заўсёды было шчасьце працоўных
мас...

# Раман з рэвалюцыяй

## *Спроба кароткага экскурсу ў нядаўнюю гісторыю*

*РЭВАЛЮЦЫЯ (ад позьнелат. revolutio — паварот, пераварот), глыбокія якасныя зьмены ў разьвіцьці якіх-небудзь зьяваў прыроды, грамадства ці пазнаньня.*
Вялікі энцыклапедычны слоўнік.

У блаславенныя гады майго ўваходжаньня ў дарослае жыцьцё, якое прыпала на канец 50-х — пачатак 60-х гадоў мінулага стагоддзя, слова «рэвалюцыя» знаходзілася ў вялікай пашане. Яно было, бадай, адным з самых сакральных словаў тагачаснай палітычнай сістэмы, побач са словамі «партыя», «Ленін», «сацыялізм», «камунізм». Праўда, пад «рэвалюцыяй» успрымалася намі ў тыя гады ў асноўным адна — так званая «Вялікая Кастрычніцкая...». Акурат увосень 2007-га быў адзначаны яе 90-гадовы юбілей...

### «Вы нам толькі шапніце ...»

Зразумела, што практычна ўсё нашае тагачаснае савецкае выхаваньне, адукацыя праходзілі пад акампанемент менавіта «рэ-

валюцыйнай песьні». І ў дарослым жыцьці высока ўзабрацца па кар'ерных прыступках мог толькі той, хто выдатна ведаў яе «словы» і «музыку». Дарэчы, немалая частка грамадства тады шчыра верыла ў персьпектывы існуючай палітычнай сістэмы. Якраз тады, на XXII зьезьдзе партыі – вядомым сьвету сваім выстаўленьнем напаказ бруднай бялізны «сталінізму» — і быў прыняты знакаміты хрушчоўскі план пабудовы камунізму, разьлічаны акурат на 20 гадкоў. І гэты, мякка кажучы, дзіўнаваты план далёка ня ўсім падаваўся ў той час абсурдным.

Сацыялізм у тыя гады калі і не квітнеў моцна, то відавочна перажываў часы свайго найбольшага ўздыму: першы спадарожнік, першы касманаўт... Да 50-гадовага юбілею «Вялікага Кастрычніка» зьявіўся на экранах кінатэатраў адзін з самых культавых савецкіх мастацкіх фільмаў — «Няўлоўныя мсьціўцы», дзе спрэчная рамантыка рэвалюцыі падавалася надзіва таленавіта, прыгожа і ўзьнёсла. Фільм пераконваў у непарыўнасьці так званай рэвалюцыйнай эстафеты, сьцьвярджаў гатоўнасьць маладых пры першым жа поклічы старэйшых стаць у шэрагі барацьбітоў: «Вы нам только шепните, мы на помощь придем!...»

А калі б хто-небудзь «шапнуў» тады, што праз нейкія два з паловай дзесяцігоддзі песьня «непераможнай рэвалюцыі» скончыцца, то ў лепшым выпадку ён атрымаў бы рэпутацыю вар'ята. Усё звонку выглядала яшчэ прыстойна – мы тады і ўявіць не маглі, што чакае нас насамрэч у выпадку, калі «над миром грянет гром», і «небо вспыхнет огнем»...

## Ад Амоса да Маркса

Дык што ж гэта было такое – «Вялікая Кастрычніцкая…»? Заканамерная гістарычная зьява, як пераканальна сьцьвярджалі яе духоўныя бацькі ці звыродлівы выбрык гісторыі? Наўрад ці магчыма сёньня аб'ектыўна ацаніць гэтую падзею. 90 гадоў, што прамінулі, відавочна, занадта малы ў гістарычнай рэтрасьпектыве тэрмін — мы пакуль усё яшчэ «лицом к лицу»... І тым ня менш…

На працягу амаль усёй сваёй гісторыі лепшыя розумы чалавецтва імпэтна займаліся пошукамі шляхоў сацыяльнай гармоніі. Ствралася безьліч тэорыяў з рэцэптамі, як выпекчы і як падзяліць сукупны грамадскі пірог, каб усе былі запатоленыя. Менавіта тут і былі фармальныя вытокі зараджэньня камунізму. Гэтае вучэньне ўпарта і мэтанакіравана прабівала сабе шлях не дзясяткі гадоў і нават ня сотні. У розных абліччах і пад рознымі назвамі яно шчыравала, бадай што, на працягу ўсёй гісторыі цывілізацыі. Ягоныя выкладкі можна адшукаць яшчэ ў VIII стагоддзі да н.э., калі старажытныя яўрэйскія прарокі Амос, а потым Іёль настойліва даводзілі тагачасным правячым элітам пра «запраграмаваную» Найвышэйшым спаконвечную роўнасьць між людзьмі і несправядлівасьць усялякае эксплуатацыі чалавека чалавекам. (Скончылася, дарэчы, гэта для абодвух сумна...) У IV стагоддзі да н. э. іхнюю эстафету падхапіў Платон. Якраз ён і стварыў першае ў гісторыі вучэньне, дзе роўнасьць аргументавалася з філасофскага гледзішча. І надалей шматлікія мысьляры імкнуліся ўдасканаліць тое вучэньне...

Падагуліў тытанічныя высілкі сваіх папярэднікаў Карл Маркс. Ягонае ёмкае тэарэтычнае «дзіцянё» пад назваю «Капітал», народжанае ў другой палове XIX стагоддзя, хоць, магчыма, і было вонкава ня вельмі сімпатычным, але стала грунтам вучэньня, пра якое наступнікі сьцьвярджалі, што яно «ўсемагутнае, бо слушнае». Марксава тэорыя, на думку яе барадатага аўтара, мусіла нарэшце вывесьці чалавецтва на якасна новы бальшак грамадскага разьвіцьця. Тыя, хто падчас «прэзентацыі» марксізму, высьмейвалі яго, як камуністычны «талмуд», абсалютна «неядомы» для шырокіх масаў, моцна пралічыліся. У марксавага «дзіцяці» знайшлося шмат здольных выхавальнікаў, якія паціху дапамаглі яму вырасьці да ўнушальных маштабаў.

І праз якія паўсотні гадоў пасьля нараджэньня «Капіталу», закладзеная Марксам «бомба» выбухнула. Але яе асколкі рассыпаліся, не ў Заходняй Еўропе, як меркавалася, а ў Расіі. Менавіта на расейскай глебе гэтае насеньне дало нечакана багатыя ўзыходы, узросшы ў адзін з самых жахлівых сацыяльных катаклізмаў на планеце – расейскую рэвалюцыю.

У кастрычніку 1917 году над шостай часткай зямной сушы запанавала «надоўга і ўсур'ёз» сіла, якую адзін з самых галоўных яе тэарэтыкаў называў «прывідам, што блукае па Еўропе». Відаць, удосталь наблукаўшыся па цесных вулачках еўрапейскіх гарадоў і не знайшоўшы там для сябе належнага размаху, яна вырвалася на шырокія прасторы Расейскай імперыі. Тады, у 1917 годзе, гісторыя, відаць, завяршала нейкі свой грандыёзны віток па бясконцай сьпіралі часу, каб пачаць новы, адзін з самых злавесных і драматычных за ўсе часы існаваньня цывілізацыі. Як пісалі потым апынуўшыеся ў эміграцыі некаторыя з расейскіх «властителей дум», быццам бы нейкі страшэнны Малох абрынуў на Расію сваю гіганцкую дубіну!..

## Бацькі і хросныя

Узброеныя канфлікты на глебе барацьбы за дабрабыт і сацыяльную справядлівасьць, за роўнасьць і братэрства – рэвалюцыі — мелі месца ва ўсе часы. І хто быў бацькам самай першай рэвалюцыі ў гісторыі чалавецтва, сёньня цяжка сказаць дакладна А вось хроснымі рэвалюцыі (тымі, хто падарыў ёй гэтае кідкае імя — рэвалюцыя), безумоўна, былі французы. Мараты, рабесьпьеры, дантоны ўяўлялі з сябе ўжо сапраўдных, можна сказаць, класічных рэвалюцыянераў. Гэта яны ўпершыню ў гісторыі ўзьвялі на высокі п'едэстал жорсткі класавы тэрор, як адзін з неад'емных элементаў рэвалюцыі. Менавіта тады «Мадам рэвалюцыя» ўпершыню ва ўсю моц праявіла свой сапраўдны характар — ёй стала мала ручаінаў крыві, спатрэбіліся рэкі. Куды там кульгаваму Тамерлану з ягонымі курганамі сьсечаных шаблямі галоваў. Французскія барацьбіты за справядлівасьць, роўнасьць і братэрства пры дапамозе зручнай машыны пад назваю гільяціна паставілі галоўную рэвалюцыйную справу на канвеер. Якраз тады ў гэтай сур'ёзнай справе пачалася сапраўдная (як сёньня кажуць) сістэмная, селекцыя — галовы імкнуліся адсякаць не абы-якія, а адборныя, арыстакратычныя. (Потым, праўда, калі арыстакраты скончыліся, узяліся за ўсіх іншых...)

Але тэрор гэта так, між іншым, мэтай жа ўсялякай рэвалюцыі заўсёды было шчасьце працоўных мас...

Як катэгорыя філасофская, шчасьце – рэч даволі супярэчлівая… І ўвогуле ці дасягальнае яно – вялікае, татальнае, усеабдымнае шчасьце, жаданае і спакусьлівае, аднолькавае і роўнае для ўсіх? А калі дасягальнае, то якую цану трэба за яго заплаціць? Апошняе пытаньне не рытарычнае, і каб адказаць на яго, нам ніяк не абмінуць стасункі Фауста і Мефістофіля. Але пра тое крыху ніжэй...

Разам з тым, памкненьне да шчасьця, як да нейкай ідэальнай абсалютнай вяршыні, напэўна, рэч натуральная для чалавека. Усё жыцьцё мы шчыра верым, што шлях да тае вяршыні рэальны, толькі патрэбна яшчэ трошачкі паднапружыцца, пацярпець і мы, нарэшце, дапяўшы жаданае мэты, атрымаем узнагароду. Праўда, для большасьці тая ўзнагарода так і застаецца рэччу недасягальнай. Яна, гэтая большасьць пакорліва мірыцца з бязьлітаснай дыялектыкай жыцьця і фатальна прымае непазьбежнае. Але ёсьць сярод яе і такія, якія (скарыстаем альпінісцкую тэрміналогію) зноў і зноў пачынаюць штурм тае цяжкадаступнай вяршыні...

Добра, калі такія «альпіністы» шыбуюць наверх у ганарыстай самоце. Горш, калі яны ў «зьвязку» мімаходзь ублытваюць родных, блізкіх, а то і проста выпадковых спадарожнікаў. Бо калі абарвешся ў адзіночку, то адкажаш за ўласныя амбіцыі і пралікі сам. Намнога цяжэйшыя наступствы, калі абрынаецца ўся «зьвязка». І чым болей у ёй «шукальнікаў» шчасьця, тым вынікі цяжэйшыя. Што казаць, калі ў рашучы

рэйд у пошуках «к шчасьцю дарог» скіроўваецца цэлы народ! Ды ня проста народ, а адзін з буйнейшых у сьвеце, з немалою роляй у сусьветнай гісторыі...

Але, каб штурмаваць невядомыя вяршыні, абавязкова патрэбен «шэрп-праваднік», які б дапамог пракласьці маршрут. І такі «шэрп-праваднік» у гісторыі Расіі знайшоўся. Ім стаў У.Ульянаў (Ленін), які «творча» перапрацаваўшы Марксава вучэньне, у 1917-ым разам «со товарищи» бліскуча рэалізаваў яго на практыцы.

## Касандры рэвалюцыі

Бальшавікам удалося тады велізарную краіну пад назовам Расія шпурнуць на доўгія гады ў жахлівы «стопар», з якога яна, мяркуючы па ўсім, ня выйшла і сёньня. Але чаму энергія рэвалюцыі, якая назапашвалася ў «пралетарскіх» краінах Захаду, выбухнула вулканам у практычна сялянскай Расіі? Ці была ўвогуле нечаканай гэтая падзея ў «асобна ўзятай краіне» — буйнейшай і адной з магутных на той час імперыяў сьвету?

Сыны Расіі ня раз прадказвалі ёй сацыяльныя катаклізмы. Адзначым найперш вядомага расейскага сьвятара Іаана Кранштадскага: «Царства рускае хістаецца, блізкае да падзеньня...». «Сацыялізм, — даводзіў «рэвалюцыянер-дэмакрат» Аляксандр Герцэн, — будзе разьвівацца ва ўсіх сваіх фазах да крайніх наступстваў, да абсурду...» Меў благія прадчуваньні і наш зямляк — Фёдар Дастаеўскі: «...выйдзе такі морак, такі хаос, нешта... грубае, сьляпое, бесчалавечнае, што ўвесь будынак рушыцца пад праклёнамі чалавецтва, да таго як будзе завершаны...». Ды і што, як не бліскучае прадказаньне рэвалюцыі, ёсьць ягоны знакаміты раман «Бесы»? Дакладна «адлюстроўваў « будучыя працэсы» і «люстэрка рускай рэвалюцыі» Леў Талстой: «Да ўлады прыйдуць балбатуны-адвакаты і прапойцы-памешчыкі, а пасьля іх — мараты і рабесьп'еры».

Ну а найбольш вобразнымі ў хоры прарокаў былі паэты: «Настанет год, России чёрный год, Когда царей корона упадёт...» – сурова і прыгожа прадракаў Міхаіл Лермантаў. «Люди, вы ль не узнаете Божией десницы:/ Сгибнет четверть вас от глада, мора и меча...» — ня менш трагічна сьцьвярджаў Аляксандр Блок.

У «чорны» 1917 год прадказаньні тыя збыліся дакладна — да ўлады і насамрэч прарваліся спачатку «балбатуны-адвакаты», а потым не прымусілі сябе чакаць і расейскія «мараты з рабесьп'ерамі». Якраз у Расіі сацыялізм лёгка «разьвіўся да крайніх наступстваў». Значная частка народу гэтай краіны, праігнараваўшы свае традыцыйныя каштоўнасьці, па сутнасьці зрабіла выбар на карысьць чужых...

Ну а потым не прамарудзіла і «дзясьніца Божая» …

Зрэшты, ці быў 1917-ы выпадковасьцю для Расіі? Гісторыя сьведчыць, што рэвалюцыйны дух традыцыйна ня быў чужым для бясконцых расейскіх прастораў. Шлях разьвіцьця нашай суседкі даволі шчыльна памечаны вехамі шматлікіх «дзікіх і бясссэнсавых» бунтаў. Згадаем сімпатычна пададзеных у савецкай школьнай праграме Балотнікава, Разіна, Пугачова, што «несьлі вызваленьне прыгнечанаму народу. «Не, ня быў народ расейскі да 1917-га спрэс «благостным» і патрыярхальным. Пасьля Кастрычніка будучы нобелеўскі лаўрэат Іван Бунін мусіў прызнаць, што меў-ткі гэты народ самую што ні на ёсьць прыроджаную схільнасьць да брутальнага разбурэньня. «Менавіта з іх, з гэтых самых русічаў, спаконвеку слаўных сваёй антысацыяльнасьцю, — пісаў ён, — якія далі са свайго асяродку безьліч «удалых разбойнікаў», бадзягаў, бегуноў, а потым хітроўцаў, басякоў, якраз з іх і вербавалася краса і гонар, надзея рускай сацыяльнай рэвалюцыі...» Таму крыху дзіўнымі падаюцца меркаваньні тых дасьледчыкаў, якія ў стварэньні рэвалюцыйнай сітуацыі 1917 году ў Расіі абвінавачваюць або зьнешніх «экспарцёраў», або «іншародцаў», якія непасрэдна высявалі на расейскай зямлі тое д'ябальскае насеньне...

## Карані і крона

На думку многіх дасьледчыкаў расейскай гісторыі, галоўная «заслуга» ў падрыхтоўцы глебы для рэвалюцыі належала расейскай інтэлігенцыі, якая ледзь ня ўсім ладам свайго жыцьця другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя актыўна працавала на будучую рэвалюцыю. І як магло быць інакш, калі тыя інтэлігенты ўжо ад свайго нараджэньня выхоўваліся ў рэвалюцыйным духу. Іх сутнасьцю, як пісаў Пётр Струве, было «адшчапенства». То бок яны былі па сваім выхаваньні абавязаныя супрацьпастаўляць сябе дзяржаве і ўсялякай уладзе. А выток таго выхаваньня, па меркаваньні тых жа гісторыкаў, варта шукаць у еўрапеізацыі, якой крута ўздыбіў Расію ў свой час неўтаймоўны Пётр І. Менавіта з тых часоў, мяркуюць яны, расейская інтэлігенцыя ў сваім сьветапоглядзе пачала кіравацца выключна рэцэптамі еўрапейскай філасофіі, а найбольш — нямецкай. І ўсе недахопы апошняй — празьмерную кніжнасьць, тэарэтызаваньне, адарванасьць ад рэальнага жыцьця – акуратна ўвабрала ў сябе.

Але ці магло быць інакш у краіне, дзе галоўныя галіны правячага імператарскага дому, які практычна задаваў тон у інтэлектуальным жыцьці расейскіх элітаў, былі этнічна наскрозь нямецкімі?

Ну а ключавымі духоўнымі постацямі, якія найперш паўплывалі на еўрапеізацыю расейскай інтэлігенцыі, былі, безумоўна: Лейбніц, які быў ня толькі выдатным матэматыкам, але і знакамітым філосафам, галоўны «дыялектык» Гегель і, урэшце, Маркс. Да гэтай гжэчнай нямецкай кампаніі варта дадаць і французаў: Русо і, канешне ж, Вальтэра, – аднаго з ідэйных натхняльнікаў Французскай рэвалюцыі, што заразіў расейскую эліту так званым вальтэрыянствам (інакш нігілізмам) – моцнай схільнасьцю да зьвяржэньня ўсялякіх аўтарытэтаў.

Як вядома, праз пэўны час пасьля «Вялікага кастрычніка» сацыялістычныя ідэі «вялікіх немцаў» атрымалі магчымасьць рэалізавацца і ў самой Германіі, спачатку ў «Баварскай рэспубліцы», а потым у часы «небезьвядомага» Адольфа Гітлера.… Адзначым, што пазьней шмат хто з сацыялістычных «тэарэтыкаў», як расейскіх, так і нямецкіх, атрымалі выдатную магчымасьць шліфаваць свае тэарэтычныя «дасьледаваньні» практычна — ў засьценках і канцлагерах НКВД-КДБ і гестапа. Там яны ад душы маглі паспрачацца, чый рэвалюцыйны шлях быў больш слушным...

## Слабае зьвяно

Паўторым, трагічныя прадказаньні расейскіх «касандраў» рэвалюцыі, што (як, да прыкладу, Дзьмітрый Меражкоўскі) нутром адчувалі «грядущего хама», цалкам спраўдзіліся. Расейскі адрас рэвалюцыі, дарэчы, дакладна прадказваў у свой час і сам будучы яе правадыр У. Ленін. «Сацыялістычная рэвалюцыя ня можа перамагчы адначасна ва ўсіх краінах,— пісаў ён падчас першай сусьветнай вайны. — Яна пачнецца ў такой краіне, дзе супярэчлівасьці імперыялізму дасягнулі найбольшай вастрыні... Такая краіна будзе ўяўляць з сябе найбольш слабое зьвяно ў ланцугу імперыялізму і тут лягчэй за ўсё парваць гэты ланцуг...»

Такое вось «слабае зьвяно» — краіну для будучых маштабных сацыяльных эксьперыментаў – Уладзіміру Ільлічу доўга шукаць не давялося – ён у ёй нарадзіўся, рос і набіраўся ў яе універсітэтах — рассадніках «рэвалюцыйнага духу» — карыснага для такіх мэтаў досьведу...

Якімі ж былі мэты «Вялікага Кастрычніка» ў Расіі? Зазірнем у знакамітую «Дэкларацыю правоў працоўных і эксплуатуемага народу», прынятую на III Усерасейскім зьезьдзе Саветаў напачатку 1918 году, і там прачытаем чорным па беламу: «зьнішчэньне ўсялякай эксплуатацыі чалавека чалавекам, поўная ліквідацыя падзелу грамадства на класы, бязьлітаснае падаўленьне эксплуататараў»…

Як бачым, тыя мэты выглядалі надзіва прывабна. І, што самае цікавае, яны былі цалкам дасягнутыя. Праўда, тады ніхто і не падазраваў, што ў выніку замест зьнішчанай «усялякай эксплуатацыі», народы Расіі атрымаюць такую, якая не магла ім прысьніцца нават у самым кашмарным сьне. Куды там нягодам няшчасных рабоў — будаўнікоў егіпецкіх пірамідаў ці кітайскай сьцяны да рэальнасьці «стваральнікаў» Беламорканалу або абсурднага даваеннага БАМу, прыгонным сялянам Салтычыхі да «дабраахвотна» калектывізаваных калгасьнікаў якога-небудзь «Пути к коммунизму»!..

Таму наўрад ці вышэйзгаданыя мэты былі галоўнымі спрунжынамі рэвалюцыі ў Расіі. Пацьверджаньне гэтаму няцяжка знайсьці ў дарэвалюцыйных працах усё таго ж гранічна шчырага Ільліча. Гэты заўзяты інтэрнацыяналіст даволі празрыста выяўляў у іх самы звычайны нацыянальны інтарэс тагачасных расейскіх палітычных элітаў. Будучы правадыр сусьветнага пралетарыяту неаднаразова зазначаў, што «...ў Расіі назіраецца грандыёзнае засільле замежнага капіталу, які, безумоўна, сьвядома тармозіць разьвіцьцё важнейшых у стратэгічным плане галінаў прамысловасьці Расіі, напрыклад, машынабудаваньня, і штогод выкачвае з краіны сотні мільёнаў рублёў у выглядзе прыбытку і працэнтаў па займах…». Такі стан рэчаў, на думку будучага правадыра рэвалюцыі, небясьпечна абяскроўліваў расейскую эканоміку…

Хутчэй за ўсё якраз дзесьці тут, а не ў дэкларатыўных закліках да татальнага «вызваленьня працоўных» і хавалася адна з самых галоўных спружынаў будучай рэвалюцыі… Пэўная частка расейскіх капіталістычных «вярхоў» яўна разьлічвала падчас рэвалюцыі рукамі разьняволеных масаў расчысьціць шлях для сваіх прагматычных мэтаў. Ці не таму на першым этапе рэвалюцыі быў такім умоўным іх супраціў «няўхільнаму поступу» гэтых масаў?..

Пацьверджаньнем гэтаму служыць і той факт, што якраз бальшавікі сталіся ў выніку ці не найлепшымі ў гісторыі вялізнай імперыі выразьнікамі і абаронцамі яе менавіта імперскіх інтарэсаў. Бальшавізм ня проста стаў найбольш удалым спадкаемцам расейскай імперскасьці, ён вывеў яе на небывалы прастор — ці не траціна Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амкрыкі былі ў лепшыя яе часы пад іхняй пратэкцыяй!.. За вонкавай дэмакратызацыяй нацыянальнага пытаньня (рэформы адміністрацыйнага падзелу, аўтанамізацыя, стварэньне незвычайнага для сусьветнай практыкі палітычнага сімбіёзу – СССР), як выявілася пазьней, хавалася надзвычай жорсткая і крайне шавіністычная па сваёй сутнасьці палітыка зьнівеляваньня ўсяго адметнага ў нацыянальным плане. Якраз у «нацыянальным пытаньні» бальшавікі, трэба сказаць, асабліва «преуспели», што вылілася у часы распаду СССР ледзь не ў брутальныя наступствы для многіх нацыяў (асабліва для «роднасна блізкіх» вялікаросам украінцаў і для нас – беларусаў), ад якіх мы аніяк ня можам ачухацца і сёньня – напачатку XXI стагоддзя.…

## Саюзьнікі

Зрэшты, напярэдадні рэвалюцыйнага «прарыву» 1917-га выдатна супалі інтарэсы шматлікіх, хоць і вельмі разнастайных сілаў, усе яны былі саюзьнікамі ў справе зьвяржэньня існуючай сістэмы ўлады.

Гэта, паўторым, найперш інтарэсы пэўнай часткі буйнага нацыянальнага капіталу, што разьлічваў рукамі палітычных радыкалаў пакончыць з татальнай замежнай фінансава-эканамічнай экспансіяй. (І ня дзіва, бо на той час тая экспансія ўжо выканала сваю першапачатковую інвестыцыйную ролю, і надыйшоў час пакарыстацца яе плёнам!)

Гэта і інтарэсы тых самых каварных «іншародцаў», у якіх была свая мэта – зламаць існуючую сістэму «рысы аседласьці». І такая мэта была для яўрэйскага насельніцтва расейскай імперыі вельмі прагматычнай, бо дазваляла ня толькі падраўняць свае правы з карэнным насельніцтвам, але і між іншым рэальна засвоіць

нарэшце вышэйшыя і ключавыя сегменты расейскай уладнай сістэмы. Не сакрэт, што туды раней шлях для габрэяў, якія мелі найбольш высокі ў краіне адукацыйны ўзровень, быў практычна закрыты. І ў выніку рэвалюцыі яны ўліліся ва ўладу суперактыўна, масава запоўніўшы практычна ўсе паверхі бальшавісцкай бюракратычнай сістэмы, адыгрываючы на першым этапе яе станаўленьня ці не вызначальную ролю.

Тут, безумоўна, і крэўныя інтарэсы галоўнага праціўніка Расіі ў імперыялістычнай вайне — кайзераўскай Германіі, якая, як вядома, на мэты аслабленьня свайго праціўніка ў вайне сродкаў не шкадавала...

Ну і, нарэшце, інтарэсы ўласна арганізатараў і выканаўцаў рэвалюцыі — бальшавікоў — сьпецыфічнай палітычнай касты-клану, якая мела ў рэвалюцыі апроч мэтаў унутраных і мэты зьнешнія. У ствараемага тады бальшавіцкага «супербранямпоезда» былі ня толькі унутраныя, але і акрэсьленыя геапалітычныя задачы, яны вызначаліся дакладна, жорстка і заўсёды гранічна шчыра: рэвалюцыя ў асобна ўзятай краіне — толькі першы этап!

«Мы павінны, – пісаў У. Ленін, — дамагчыся перамогі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсіх, ці прынамсі ў асноўных краінах капіталу.» І тут не было аніякай супярэчнасьці паміж бальшавікамі-«імперцамі» і бальшавікамі-«інтэрнацыяналістамі» – гарачымі змагарамі за вызваленьне працоўных усяго сьвету. Для такога «вызваленьня» быў патрэбны добры плацдарм, якім і мусіла стаць па задуме бальшавікоў гіганцкая, універсальная па сваіх сыравінных і чалавечых магчымасьцях Расія… Гэта яе энергіяй павінен быў напоўніцу раскрucца махавік «інтэрнацыяналізму».

## «Мэта апраўдвае сродкі!»

Даволі дзіўны на першы погляд, сімбіёз вузкакланавых і геапалітычных імперскіх памкненьняў стаўся ў выніку надзвычай жывучым. Таксама плённа сілкаваўся ён і на спрадвечных цэнтрабежных імпульсах вялізнай этнамасы. Зразумела, што інтарэсы малых народаў пры гэтым проста ігнараваліся, яны былі першапачаткова асуджаныя на незайздросную ролю «спадарожнікаў» суперпланеты «Расія», а такая нацыя, як, да прыкладу, мы, беларусы — на асіміляцыю і зьнікненьне. Як вядома, хвароба імперскасьці, звышдзяржаўнасьці – рэч не унікальная. Яна вельмі доўга не паддавалася лячэньню і ў некаторых іншых народаў сьвету такіх, да прыкладу, як брытанцы ці французы. Што казаць пра расейцаў, якія на працягу многіх пакаленьняў старанна выхоліваўся ў яе традыцыях. Размова тут, зразумела, ідзе не пра натуральныя і абсалютна нармальныя нацыянальныя інтарэсы расейскага народу, на якія ён, як і ўсе іншыя народы, мае сьвятое права, рэч у спрадычнай схільнасьці гэтых інтарэсаў да «зашкальваньня», да ігнараваньня крэўных праблемаў меншых суседзяў. І рэвалюцыя 1917 году ў Расіі сталася таксама ў пэўнай ступені вынікам гэтага «зашкальваньня», маскуемага пад сацыяльную рыторыку. Здольнасьць да такога маскаваньня выдатна характарызуе маральна-этычную сутнасьць тых палітычных колаў, што няўхільна ішлі да ўлады ў 1917-ым. На чале рэвалюцыі апынуліся (ў выніку жорсткага адбору і немалой канкурэнцыі!) найбольш прагматычныя і цынічныя прадстаўнікі грамадства, для якіх знакамітае выказваньне Макіявелі: «Мэта апраўдвае сродкі» было надзіва арганічным. Зрэшты, палітычная тэхналогія, распрацаваная ў свой час Макіявелі, аказалася выключна запатрабаванай падчас стварэньня новай палітычнай сістэмы ў Расіі, якую пазьней назвалі таталітарнай. Нездарма ягоная вядомая кніга «Гасудар» была настольнай кнігай «вялікага сябра ўсіх працоўных» таварыша Сталіна, што быў у нядоўгай гісторыі сацыялізму ў Расіі адным з самых яго знакавых лідэраў. Менавіта магутная асабістая воля «гаспадара», як яго назвала бліжэйшае акружэньне, была доўгі час адным з самых дзейсных «стымулятараў» імклівага ўмацаваньня імперыі «новага тыпу», сапраўднай супердзяржавы…

## Ланцуговая рэакцыя

Сюжэт кастрычніцкага перавароту ў Петраградзе 1917 году зусім не нагадвае тую прыгожую легенду, якую шмат гадоў трымала на шчыце кампрапаганда. Не было ніякага гераічнага штурму Зімняга і іншых відовішчных «экшэн». (Да 1927 году гэтую падзею нават не называлі «Вялікай Кастрычніцкай...», а проста «пераваротам».) Нечакана нават для саміх ягоных арганізатараў, пераварот той цалкам прайшоў па іхнім сцэнары. Існуючая на той час улада «временщиков» выявіла сваю поўную ілюзорнасьць. «Адвакаты-балбатуны» ў непасрэдным кантакце з расейскімі «маратамі» і «рабесьп'ерамі» паказалі сваю поўную палітычную бясьсільнасьць. Бальшавікі без праблемаў паднялі ўладу, што (накшталт Беларусі 1994 году) тады літаральна «валялася пад нагамі», цалкам дасягнуўшы ўсіх сваіх унутраных мэтаў.

«Слаўная перамога» Кастрычніка (як і спадзяваліся бальшавікі) выклікала ланцуговую рэакцыю ў Еўропе. Сацыялісты той ці іншай афарбоўкі змаглі захапіць тады ўладу па сутнасьці ў большасьці тамтэйшых краінаў. А ў Венгрыі, Баварыі на пэўны час нават горда запунсавеў чырвоны сьцяг бальшавізму. (Дарэчы, будучы «фюрэр», адзін з арганізатараў германскай нацыянал-сацыялістычнай партыі Адольф Гітлер быў у тыя бурныя часы яфрэйтарам баварскай Чырвонай Арміі і гераічна змагаўся за яе перамогу!) Крыху пазьней найбольш рашучыя і пасьлядоўныя з іх, такія, як член італьянскай рабочай сацыялістычнай партыі Беніта Мусаліні і той жа Адольф Алаізавіч, бязьлітасна расправіліся (ці не па прыкладзе бальшавікоў?!) з рэшткамі дэмакратыі ў сваіх краінах. Яны ўсталявалі там адыёзныя палітычныя рэжымы (гранічна блізкія па сваёй духоўнай сутнасьці да бальшавіцкага), якраз такія, якія пазьней назавуць таталітарнымі.

Канешне, пэўная розьніца паміж сацыялізмам «усходнім» і «заходнім» была. У адрозьненьне ад «заходняга», які фінансавыя капіталы сваіх краінаў «асвойваў», мякка кажучы, больш ліберальна, «усходнікі» не цырымоніліся з імі, аддаючы перавагу актам «экспрапрыяцыі». Калі перакласьці гэтае слова на юрыдычную мову — «узброенаму рабаўніцтву з гвалтам». Але паколькі гэтыя акты ў краіне перамоглага пралетарыяту былі грунтоўна падмацаваныя ідэалагічнай базай і ўсё той жа фенаменальнай палітычнай дэмагогіяй, то злачынствамі іх, зразумела, не лічылі. Лозунг «рабуй нарабаванае!» – быў у доўгі час у Расіі ці ня самым папулярным....

Будзем аб'ектыўнымі, пазьней «сацыялісты» розных колераў — ад чырвонага да карычневага — ня надта ладзілі між сабой, нягледзячы на ўсе спробы знайсьці кансэнсус. Яны былі гранічна блізкія да яго ў жніўні 1939 году, але так і не змаглі падзяліць «скуру незабітага мядзьведзя»... У выніку яны сталіся падпальшчыкамі адной з самых жорсткіх войнаў у гісторыі цывілізацыі — другой сусветнай. (Праўда, не бракавала і падпальшчыкаў і несацыялістычных, якія таксама актыўна падкідвалі «дровы» ў тую печ...)

Напэўна, ня варта атаясамліваць усіх сацыялістаў, бо, зразумела, ня ўсе яны былі (і ёсьць!) «ваўкамі ў авечай скуры», якіх калісь так настойліва рэкамендаваў асьцерагацца Аўтар Вялікай Кнігі. Многія з іх у тыя смутныя часы паслужылі ў якасьці звычайных прыступак для сапраўдных «ваўкоў». Да прыкладу, сацыяліст-рэвалюцыянер Аляксандр Керанскі — зямляк Леніна. У 1917 годзе ён шмат выступаў з прамовамі, насычанымі шматлікімі абяцаньнямі, пагрозамі і ўсемагчымымі клятвамі. Гэта ён пераконваў тагачаснае расейскае грамадства, што бальшавізм ня пройдзе, што ягоны ўрад будзе стаяць перад «бязбожнымі наймітамі немцаў» да апошняга… Керанскі дажыў да вельмі сталага ўзросту і так і не зразумеў толкам, чаму гэтыя «бязбожныя найміты» так лёгка «здзьмухнулі» яго з дошкі гісторыі...

Уладзімір Ільліч – што ўтойваць – быў «ваўком» сапраўдным... Ён, насуперак агульнапрынятым стэрэатыпам, параўнальна з Керанскім выступаў публічна няш-

мат, але заўсёды, як кажуць, па справе. (Называў, да прыкладу, пэўную колькасьць гнюсных буржуяў і іхных памагатых, якіх трэ было паставіць да сьценкі, і прынцыпова патрабаваў, каб тыя планы вытрымліваліся!..)

Але, бадай, самым мацёрым сярод тых «ваўкоў» быў ужо згаданы намі таварыш Сталін. У моцы ягонай драпежнай хваткі вельмі хутка пасьля сьмерці Леніна пераканалася «ленінскае палітбюро», якое так і не пасьпела «продумать способ о перемещении товарища Сталина на более приемлемую должность…»... Затое ўсё добра прадумаў ён. Гэты, дарэчы, вытупаў з прамовамі толькі ў самых эксклюзіўных выпадках, ды як! Дасюль цытуюць яго, прагучалае з вуснаў камуніста, сьвятарскае: «Братья і сёстры!..».

Як зазначыў адзін з расейскіх эмігрантаў: «рэальныя правадыры рэвалюцыі вастрылі «зубы» бяз лішніх словаў...»

## «Мы мірныя людзі...»

Падчас свайго прыходу да ўлады бальшавікі былі гранічна шчодрымі на абяцаньні. Троцкі, да прыкладу, абяцаў усялякаму камсамольцу геній Платона і Арыстоцеля, а Ленін сьцьвярджаў, што гадоў праз 10 людзі будуць працаваць па некалькі гадзінаў у дзень, ды і то некалькі гадоў у жыцьці... І на тыя даброты, якія яны пасьпеюць напрацаваць за гэты кароткі час, яны змогуць бестурботна бавіць астатняе жыцьцё... Хто ведае, ці не з-за такіх вось абяцаньняў іхняя ідэалогія знайшла водгук у масах, што і стала адной з галоўных прычынаў лёгкай перамогі.

Масы тыя, дашчэнту знураныя цяжкай вайной, і насамрэч праглі запісаных на лозунгах бальшавікоў міру, зямлі і хлеба. Большасьць тады паверыла, што пасьля зьвяржэньня эксплуататараў іх чакаюць свабода і рост дабрабыту...

Пачнем з міру... Мяркуючы па зьведаным намі, дзеля ягонага «ўсталяваньня» Савецкая Расія і СССР «змагаліся» практычна на працягу ўсяго перыяду свайго існаваньня – ад Савецка-польскай вайны 1920-га да Афганістану 1988-га. Зразумела, у асноўным пры дапамозе гарматаў, самалётаў, а пазьней, і ракетаў.

Яшчэ бушавала Грамадзянская вайна, а рэвалюцыйная Расія ўсур'ёз пачала падрыхтоўку да будучай «татальнай вайны» (бальшавікі называлі яе «сусьветнай рэвалюцыяй»). Гэта адбывалася задоўга да прыходу да ўлады ў Германіі Гітлера, калі ніякай брутальнай пагрозы краіне перамоглага сацыялізму не было. Што цікава, але ў 20-х гадах ХХ стагоддзя, ні адна вядучая краіна сьвету не была (па розных прычынах) рэальна зацікаўленая ў разгроме бальшавізму. Болей за тое, калі б тады бальшавікі не зьявіліся самі, то іх трэба было прыдумаць. Іхняя дзяржава на чале адным з буйнейшых палітычных авантурыстаў чалавечай гісторыі найвыдатнейшым чынам легла ў тагачасны геапалітычны пасьянс, калі адбываўся стратэгічны перадзел карты Еўропы і сьвету. Тады Захад па сутнасьці лёгка «здаў» свайго былога саюзьніка па антынямецкай Антанце — царскую (а пазьней і буржуазна-дэмакратычную) Расію. І самое існаваньне антызаконнай бальшавіцкай сістэмы было адразу пасьля рэвалюцыі без вялікіх праблемаў легалізавана буржуінамі ЗША, Англіі і Францыі на вядомай Гэнуэзскай канферэнцыі.

Сапраўдным пачаткам самай жорсткай у гісторыі другой сусьветнай вайны быў не напад немцаў на Польшчу, а заключаная за некалькі дзён да гэтага дамова паміж СССР і Германіяй (пакт Молатава-Рыбентропа), згодна якой два імперыялістычных «цяжкавагавікі» акуратненька падзялілі між сабою Еўропу (зрэшты, ня толькі яе). Менавіта паводле гэтага пакту Савецкі Саюз амаль два гады бесперабойна і шчодра сілкаваў фашысцкую Германію важнейшай стратэгічнай сыравінай: хлебам, нафтай, металамі. За гэты час немцы змаглі ня толькі паставіць Еўропу на калені (што і было адной з асноўных мэтаў Сталіна), але і стварыць сур'ёзныя стратэгічныя запасы для вайны з… СССР, якую пачалі ў чэрвені 1941 году.

У гістарыяграфіі, прысьвечанай тэме другой сусьветнай, сёньня шмат спрэчак і дыскусіяў, хто быў галоўным агрэсарам і хто каго апярэдзіў ў тым крывавым чэрвені. Хто б ім ні быў, але вайна тая абышлася Краіне Саветаў коштам амаль у трыццаць мільёнаў жыцьцяў яе сыноў і дачок (нам, беларусам, яна каштавала трэці насельніцтва), брутальным разбурэньнем амаль чвэрці тэрыторыі і беззваротнаю стратаю такой жа часткі нацыянальнага багацьця.

«Барацьбу за мір» СССР працягваў ледзь не да апошніх сваіх дзён — Карэя, Усходняя Еўропа, краіны «трэцяга сьвету» ад Кубы да Вьетнаму, Афганістан. І ці не менавіта ў Афгане ваеннай моцы сацыялістычнай сістэмы быў нанесены сьмяротны удар.

## «Все во имя человека, все для блага человека...»

Ня лепш чым з мірам было становішча са свабодай і дэмакратыяй. Па сутнасьці ў пострэвалюцыйнай Расіі (пазьней СССР) народ не прымаў фактычна ніякога ўдзелу ў вырашэньні свайго ўласнага лёсу. Замест «волі народу» панавала нічым не абмежаваная «воля правадыроў», якія праводзілі яе шляхам бязьлітаснага падаўленьня нават нязначных «несанкцыянаваных» праяваў. Скінуўшы ланцугі адныя, працоўны люд атрымаў іншыя, прычым значна больш цяжкія і ганебныя, бо цяпер тыя ланцугі належала ўслаўляць і пялегаваць. І ўсё гэта – побач з «самай дэмакратычнай у сьвеце» Канстытуцыяй...

Дабрабыт... Як вядома, яго дасягненьне было адной з ключавых фармальных мэтаў усіх рэвалюцыяў. І вось якраз тут бальшавіцкую сістэму чакаў ці не найбольшы сюрпрыз. Гаспадарчае жыцьцё няўзнак аказалася скіраваным зусім не да павышэньня дабрабыту грамадзянаў, а да насычэньня прагі да ўлады кіруючага клана-касты і звышмілітарызацыі краіны. Доўгі час уся эканоміка, штурмавыя «пяцігодкі» былі падпарадкаваныя грандыёзнай мэце «сусьветнай рэвалюцыі».

Дарэчы, у такой жа «сацыялістычнай» Нямеччыне, дзе таксама выношваліся планы «сусьветнага панаваньня», германскім сацыялістам і ў галаву не прыйшло зьнішчаць «пракляты капіталізм», ён, як і ўся эканоміка краіны, быў проста «запрэжаны» ў мілітарную калясьніцу. Што цікава, на пэўным этапе, асабліва, калі былі абрабаваныя акупаваныя краіны, у Нямеччыне нават удалося падняць жыцьцёвы ўзровень народу… Зрэшты, гэта быў часовы посьпех...

У выніку савецкі лад давёў велізарную краіну да нечуванай матэрыяльнай нястачы. Нашыя дзяды і бацькі перманентна галадалі. Ды і як магло быць інакш, калі толькі напачатку 30-х гадоў XX стагоддзя падчас калектывізацыі ў СССР вымерла больш за палову жывёлы, былі засьмечаныя ці зьнішчаныя мільёны гектараў лепшых ворыўных земляў. Бяз дай-патрэбы высеклі многія тысячы гектараў лясоў. (А чаго каштавала пакарэньне цаліны!) «Уладай працоўных» у сялянскай краіне па сутнасьці быў практычна зламаны станавы хрыбет народу – сялянства, прынамсі яго найбольш працавіты і найбольш стваральны слой. Ад вынікаў « грамадзянскай вайны» на вёсцы ў гады савецкай улады сельская гаспадарка амаль на ўсёй тэрыторыі былога СССР да канца не ачуняла і сёньня — напачатку III тысячагоддзя новай эры…

Па вялікім рахунку сітуацыя на працягу практычна ўсяго існаваньня савецкай улады рэальна пагражала калі не фізічным выміраньнем, то прынамсі дэградацыяй і выраджэньнем цэлых народаў. Не памаглі і шчодрыя нафтадолары 70-х, пры дапамозе якіх меркавалася, да прыкладу, хаця б часткова адрадзіць сельскую гаспадарку. Але працэс, як кажуць, зайшоў занадта далёка…

## Рэальны падмурак

У СССР кіруючыя эліты імкнуліся манапалізаваць практычна ўсе сферы чалавечага жыцьця — ад размеркаваньня «пайкі» ледзь не да інтымных стасункаў. Невялікі слой грамадства, які відавочна паразітызаваў на новым ладзе, практычна амаль нічога для патрэбаў самога чалавека не ствараючы, перашкаджаў ствараць іншым.

Найбольш жорсткаму прэсінгу з боку ўлады «рабочых і сялянаў» падвяргаліся адукацыя і культура — можна сказаць, сапраўднай вівісекцыі. Пастаянна татальнай рэвізіі падвяргалася духоўная спадчына і надзённыя дасягненьні — аж да публічных аўтадафе. На тыя ж спартыўныя дасягненьні часта па сутнасьці працавала ўся краіна – навідавоку быў дысбаланс затрачаных велізарных сродкаў і высілкаў з вынікамі. Што да посьпехаў навукі, то гэты момант мажліва лічыць адным з самых парадаксальных і цікавых у гісторыі сацыялістычнай сістэмы – яна-такі магла часам прымусіць «салаўя» навуковага генія таталітарнае краіны засьпяваць і ў клетцы (у шаражцы). Але наўрад ці карэктна лічыць, да прыкладу, вялізны ракетна-ядзерны патэнцыял і вынікаючы з яго «парытэт страху» з ЗША «грандыёзным дасягненьнем». Ды і ў тым жа касьмічным спаборніцтве з амерыканцамі СССР урэшце прайграў...

Але ў выніку дасягненьні і «прарывы» ня сталі рэальным падмуркам сацыялізму ў СССР. Якімі б яны ні былі, яны ўрэшце, па сутнасьці, растварыліся ў бязьмежным балоце неверагоднай безгаспадарчасьці. А тыя духоўныя і інтэлектуальныя ідэі, якія ня ўкладваліся ў ідэалагічную схему, хоць і маглі ўмацаваць сістэму, без асаблівага роздуму адкідваліся. Якраз ідэалогія вызначала практычна ўсё духоўнае жыцьцё краіны, маральны воблік савецкага чалавека. Рэвалюцыйная мараль доўгі час падпарадкоўвалася найперш законам канфрантацыі, што было для ўзрастаючых пакаленьняў сьпецыфічнай маральнай школай. Шмат якія спаконвечныя маральныя прынцыпы скажаліся, а то і ставіліся з ног на галаву, наступствы чаго мы адчуваем і сёньня...

Да прыкладу, і сёньня ў Беларусі мы працягваем мець справу з феноменам так званага «інстытуту стукацтва», які, як сьцьвярджаў Васіль Быкаў, у лепшыя яго часы ахопліваў больш за пятую частку насельніцтва краіны! Хто ведае, ці ня ён, гэты сьпецыфічны «інстытут», які мае ў гісторыі, відаць, толькі адзін дакладны аналаг – у гітлераўскай Германіі — заснаваны на страху і подласьці, і быў рэальным падмуркам «рэальнага сацыялізму»? Але ці магчыма было на такім вось падмурку ствараць сапраўдныя духоўныя і матэрыяльныя скарбы…

## Цана «шчасьця»

І вось якраз тут, відаць, дзесьці і схаваная разгадка крыніцы той вялізнай энергіі, што ўжо ў першыя «10 дзён» узрушыла ўвесь сьвет «до основанья», а «затем» амаль 80 гадоў ліхаманкава яго калашмаціла. А заадно адказ на пытаньне пра сапраўдную цану рэвалюцыйнага шчасьця...

Рускі пісьменьнік Усевалад Гаршын бліскуча прадказаў стан рэвалюцыйнага ўздыму ў адным са сваіх апавяданьняў, напісаным, дарэчы, за некалькі дзесяцігоддзяў да Вялікай Кастрычніцкай: «... памятаю толькі хваляваньне, якое ахапіла душу, разам з усьведамленьнем страшэннай сілы масы, да якой мы належым, і якая захапіла цябе цалкам. Адчуваеш, што для гэтай масы няма нічога немагчымага, што плынь, з якою я разам быў у памкненьні і зьяўляўся яе часткаю, ня можа цярпець перашкодаў, што яна ўсё зламае, усё зьнявечыць, усё зьнішчыць...»

Вось так тая маса і ламала, нявечыла, нішчыла лёсы дзясяткаў мільёнаў людзей. Зразумела — у імя сьветлай будучыні!.. Безумоўна, чалавечая душа ў такіх экстрэмальных варунках цярпела страшэнную дэфармацыю. «Коні з ланцуга сарваліся, хіба толькі ля акіяна спынімся... Хочаш ня хочаш — гуляй з намі...» — заклікаў адзін з герояў апавяданьня А.Талстога «Гадзюка». І «гулялі» на ўсю іванаўскую!… Што там адзінкавая, нават самая унікальная, чалавечая душа, калі коні рэвалюцыі з лан-

цуга сарваліся!.. Яе, гэтую душу, па сутнасьці кідалі тады пад капыты тых коней, на якіх апантаныя «змагары» зьбіраліся прайсьці праз увесь сьвет.

Так, менавіта ёй, чалавечай душой, і даводзілася тым, хто тварыў рэвалюцыю, расплачвацца за хаўрус з сатанінскай «магутнай воляй». І яны аддавалі яе з неверагоднай лёгкасьцю…

Вялізная няўхільная і амаль некіруемая энергія рэвалюцыі цалкам паглынала масы людзей, захопленых ёю, а ўзамен давала, як пісаў Міхась Зарэцкі, «нянавісьць ва ўсю волю душы». Гэтую нянавісьць было вельмі цяжка рэгуляваць нават і ў дарэшты знармаваным таталітарным грамадстве. Рэвалюцыя ў выніку сталася нечым значна больш страшным, чым скрынка Пандоры, і маштабы пазьнейшых трагедыяў нашай гісторыі тое пацьвярджаюць…

Безумоўна, сацыялізм, сапраўдны баявы рэвалюцыйны сацыялізм, а не ягоны фабіянскі сурагат, зрабіў стаўку якраз на нянавісьць. Яе было зусім няцяжка сеяць у масах расейскага народу, вякамі заражанага яшчэ адным грахом напоўніцу — зайздрасьцю, якая, відавочна, была таксама ці не адной з самых магутных рухальных сілаў рэвалюцыі 1917 году. Нянавісьць, зайздрасьць проста неабходна было сеяць у масах, каб падзяляць іх і ўладарыць, каб эфектыўна будаваць сваю, як сьцьвярджаў Дастаеўскі, Вавілонскую вежу, на якой, як вядома, Богу месца не было...

## Бумеранг

Наўрад ці разумелі марозавы і абушынскія выпускаючы на пачатку ХХ стагоддзя «джына» бальшавізму з бутэлькі, якія будуць наступствы такога легкадумнага кроку для іх саміх. Згаданаму «джыну» зусім не хацелася дзяліцца «вялікай перамогай» ні з кім, і ён бязьлітаснай рэвалюцыйнай мятлою вымеў з краіны і «нацыянальны» капітал, і спрэс рэвалюцыянізаваную інтэлігенцыю. Не мінула тая мятла нікога са спадарожнікаў і саюзьнікаў бальшавікоў, якія нямала зрабілі для разбурэньня дзяржаўнай сістэмы Расіі. Разам з імі «пайшлі пад нож» цэлыя класы і слаі грамадства. Не абмінулі ні чыноўніцтва, ні вайскоўцаў, ні купецтва, а заадно з імі і шмат тых, хто нават патэнцыйна ня мог быць бальшавізму ворагам...

Па вялікім рахунку тэрор гэты, ды і ўвогуле тэрор усялякіх рэвалюцыяў, скіроўваўся ня толькі супраць пэўных класавых ці расавых ворагаў, але і супраць усяго народа. Якраз народ спаўна расплаціўся за «эксьперымент»—дзясяткамі мільёнаў чалавечых жыцьцяў!.. І зусім не паталагічная крыважэрнасьць маратаў, рабесьп'ераў, леніных, сталіных была прычынай рэвалюцыйнага тэрору. Усё даволі проста — гвалт быў і ёсьць адзіным натуральным спосабам падтрыманьня ненатуральных грамадскіх канструкцыяў!.. Зьнішчаючы «ворагаў народу», «слугі рэвалюцыі» ліквідоўвалі ня столькі сваіх ворагаў, колькі найбольш адметных, тых ў каго была воля да свабоды, талент, лепшыя генетычныя «праграмы» наступных пакаленьняў.

Потым, на фінішы «вялікай зачысткі» пад каток патрапіла і большасьць «маўраў» — непасрэдных выканаўцаў рэвалюцыі 1917-га і татальных рэпрэсіяў. Вялікага маху далі тыя, хто разьлічваў на хрыбце монстра рэвалюцыі «заехаць у рай». У будуемым новым Эдэме на іх яўна не разьлічвалі, не зважаючы ні на якія заслугі перад Рэвалюцыяй! Шмат хто з іх у 1937 годзе, ідучы на плаху, ніяк ня мог уцяміць, як ім здавалася, абсалютнага абсурду – чаму рэвалюцыя з такім апетытам глытала сваіх лепшых дзяцей і нават не аблізвалася?!..

## Мяжа Стомленасьці

Цікава, дарэчы, адсачыць стаўленьне некаторых народаў сьвету да прыходу

«рэальнага» камунізму. Найбольш яўную перамогу ён атрымаў якраз там, дзе найбольш трывалыя і выразна традыцыйныя комплексы ў грамадскім і цывілізацыйным стане (Кітай, Манголія, Карэя), народы якіх прынялі камунізм як нейкую сьвяшчэнную неабходнасьць, рок.

Менавіта як рок прынялі камунізм у 1917 годзе і многія ў Расіі. Але ўсё ж ня будзем забываць, што адрозна ад той жа Германіі, дзе ў 1933 годзе ўзьнік падобны таталітарны сацыялістычны рэжым, і дзе ў абарону нямецкай дэмакратыі не падняўся ні адзін штык, у Расіі пасьля часовага шоку разгарэлася і некалькі гадоў запар вялася адна з самых жорсткіх у гісторыі грамадзянскіх войнаў. «Что такое Советская власть?» — паціху пачало даходзіць да многіх. «Сьветлай будучыні» не схацелі ня толькі «рэакцыйныя» генералы, памешчыкі і капіталісты. Потым спахапіліся яраслаўскія і ўральскія рабочыя, петраградскія і маскоўскія чыгуначнікі, кранштацкія матросы, тамбоўскае, слуцкае (ды і бадай што ў розныя часы і большасьць) сялянства. Усё гэта вылілася ў паўстаньні, якія каштавалі сотні тысячаў, а то і мільёны чалавечых жыцьцяў. Таксама мільёны людзей пасьля перамогі бальшавікоў (зусім, паўторым, ня горшых) зьехалі ў эміграцыю.

Гэта ўжо пазьней у Расіі зьявілася незразумелая фатальная пакора мас. Як быццам нешта зламалася ў механізме супраціўленьня гвалту. І калі наступіў час другога этапу рэвалюцыі — час той жа калектывізацыі сялянства, супраціўленьне па вялікім рахунку было толькі эпізадычным. У той момант пакора перад Ліхам была амаль містычнай... Відаць, і ў народаў, як і ў металаў, рана ці позна пад перманентным ціскам наступае Мяжа Стомленасьці.

## Гібель «браняпоезда»

Зразумела, што чалавецтва ніколі не пагодзіцца з меркаваньнем, што ў складаным лабірынце разьвіцьця цывілізацыі ўсе шляхі да сацыяльнай гармоніі безвыніковыя і вядуць у тупік. Павінен жа, урэшце, быць і шлях да Сьвятла! Але сумныя вынікі большасьці рэвалюцыяў прымушалі усё тыя ж лепшыя яго розумы шукаць трохі менш радыкальныя сродкі для дасягненьня «ўсеагульнага шчасьця», чым тая ж гільяціна. Рэвалюцыя — як пісаў расейскі паэт Васіль Жукоўскі — гэта зьнішчальныя высілкі пераскочыць з панядзелка наўпрост у сераду...» Шмат хто пераконваў, што чалавечаму грамадству варта пазьбягаць рэзкага памкненьня «адразу ў сераду», не мітусіцца, а цярпліва працаваць, што рух да шчасьця ня можа быць імклівым, як кавалерыйская атака.

Але эвалюцыя, як вядома – рэч вельмі ўжо памяркоўная! Яе шлях зьвязаны з тытанічнай працай на стварэньне і, відавочна, што ён вельмі працяглы. А тое ж шчасьце давай «тут і цяпер!» Вось тады і прыходзіў час выходзіць на сцэну Мадам рэвалюцыі – хто ж хутчэй за «мадам» можа ў жыцьці ашчасьлівіць?

Згадваючы часы сваёй маладосьці, адзначу, што нас тады цалкам пераканалі, што будыніна наскрозь «прагнілага» сусьветнага капіталу дэградавала маральна і фізічна і толькі чакае штуршка з боку сацыялізму, каб з грукатам абрынуцца. Штуршок урэшце адбыўся і «будыніна» абрынулася… Ды ня тая…

Ёсьць меркаваньне, што сацыялізм на восьмым дзясятку гадоў ягонага існаваньня зьнішчылі цёмныя змовы ўсемагчымых ворагаў. Але якая цана такому арганізму, што мае слабы імунітэт да зьнешне агрэсіўнага асяроддзя?.. Вынікае, што ён проста ня вытрымаў натуральнага адбору. У народзе пра такіх аслабленых і хваравітых заўсёды казалі — «дахадзяга».

Зрэшты, сапраўдны камунізм усё ж такі быў пабудаваны. Праўда, ён не для ўсіх, а для ўзрошчанай жорсткай селекцыяй унікальнай касты «выбраных», прамых нашчадкаў нізвяргальнікаў 1917 году. Гэта яны на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя нават на самой гібелі бальшавісцкай «Пампеі» і на горы мільёнаў простых людзей здолелі нажыць сабе фантастычны капітал. Фінансавая афера, праведзеная пад час

развалу СССР, была настолькі унікальнай, што, відавочна, ня мае прэцэдэнту ў гісторыі!..

Але наўрад ці варта зайздросьціць гэтым людзям...

Паўторым, ён быў нечакана вялікі, той энергетычны зарад, які штурхаў вялізныя масы людзей у даволі тлумныя, незразумелыя для іх, але такія захапляльныя пошукі «новага жыцьця» ў 1917 годзе. Працягласьць імпульсу таго «штуршку» была проста сенсацыйнай! Але высакародныя мэты сталіся больш тэарэтычнымі. У густым пыле і дыме, узьнятых пасьля падзеньня ў 1917 годзе Расейскай імперыі, практычныя, нават найбліжэйшыя мэты, было вельмі і вельмі цяжка разгледзець. Ды ніхто надта і ня рупіўся. Тады здавалася, што няўхільны браняпоезд рэвалюцыі выйшаў на галоўную магістраль, яго ўжо не спыніць, а там — пабачым!.. Потым, калі самыя высокія і сьветлыя з тых мэтаў няўзнак трансфармаваліся ў сваю супрацьлегласьць, то, як і прадказваў калісьці Томас Гобс, рэвалюцыйны Левіяфан, адчуўшы востры смак чалавечай крыві, усё болей загразаючы ў густой багне сваіх злачынстваў, пачаў інтэнсіўна працаваць на самазьнішчэньне…

«Усялякае грамадства, — як сьцьвярджаў той жа Гобс, — гэта «штучная машына», шрубкамі якой зьяўляюцца менавіта людзі. Дзеля нейтралізацыі празьмернай штучнасьці тае «машыны» і яе адмоўнага ўзьдзеяньня абавязкова мусіць мець месца свабода гандлю і абмену – рэчы спаконвечныя, прыродныя і натуральныя…» Напэўна і дзесьці тут — яшчэ адна з прычынаў гібелі эфектнага, але, як выявілася, мала эфектыўнага «браняпоезду» бальшавісцкай рэвалюцыі. «Кацёл» ягонага паравозу ня вытрымаў унутранага напружаньня, узарваўся, і гэты фантастычны цягнік «сышоў з рэек» на вачах усяго сьвету. Свой «апошні і рашаючы» бой камунізм, па ўсім відаць, прайграў, пераўтварыўшы высакародную мэту ў найвялікшую ў гісторыі містыфікацыю.

Асэнсоўваючы прычыны глабальнага паражэньня «Вялікага Кастрычніка», нельга ніяк абмінуць тут ролю ўласна расейскага народу, што быў як галоўным інструментам, так і галоўным аб’ектам той рэвалюцыі. Яшчэ ў другой палове 19 стагоддзя знакаміты французскі белетрыст А. Дзюма пасьля паездкі ў Расію адзначыў: «Рускія ніколі не даводзяць пачатую справу да канца, яна не выходзіць за межы абсалютнай неабходнасьці канкрэтнага моманту. Калі патрэба мінавала, пачатую справу кідаюць на паўдарозе, на волю лёсу – замест таго, каб падтрымаць, давесьці да завяршэньня...» Ледзь не ва ўнісон з французам піша вядомы расейскі кінарэжысёр Андрэй Міхалкоў-Канчалоўскі: «Самыя тыповыя негатыўныя якасьці рускай душы: непасьлядоўнасьць, адсутнасьць усьведамленьня ўласнай годнасьці..., недавер да сябе, да сваёй будучыні, абыякавасьць да сучаснасьці...»

Хто ведае, магчыма і дзесьці тут адна з прычынаў разгадкі гібелі бальшавіцкага браняпоезду.

## Беларускі фрагмент

Што ўтойваць, на вялікім сацыялістычным «палатне» наш беларускі «фрагмент» заўсёды выяўляўся ці ня самым агранічным. Беларусы змаглі неяк прыстасавацца да ягонага змрочнага фону, магчыма, дзякуючы якраз сваім самым характэрным нацыянальным рысам – прыцярпеласьці і памяркоўнасьці.

Але, шчыра кажучы, тое нашае «прыстасаваньне» было зусім нялёгкім. Яно адбывалася пакутліва, са скрыпам, праз сотні тысячаў забітых на Грамадзянскай, праз нярэдкія тады паўстаньні, накшталт знакамітага слуцкага збройнага чыну, якім мы будзем ганарыцца яшчэ не адно пакаленьне. Бальшавізм адзначыўся ўжо ў першыя гады свайго існаваньня на беларускай зямлі. У той час Янка Купала пісаў: «Над Менскам павіс крывавы кашмар... Курганы сотняў нявінна расстраляных аб гэтым... сьведчаць...»

Прыстасаваўся ўрэшце (прынамсі зьнешне) да жорсткіх рэаліяў і сам народны

паэт... Але рэжым ніколі насамрэч не прызнаваў сваім яго, зьвёўшы з Вялікім паэтам рахункі пры першым жа зручным моманце... Такія творцы як Купала, Жылка, Зарэцкі, Дубоўка і многія іншыя, імёны якіх зрабілі б гонар любой нацыі, выдзяляліся нібы яркія «сланечнікі» на фоне «пустазельля», таму яны яўна выпадалі з абоймы...

«Прыстасоўваўся» наш народ праз раскулачваньне лепшых сельскіх гаспадароў напрыканцы дваццатых — пачатку трыццатых, праз зьнішчэньне (татальнае!) нацыянальнай інтэлігенцыі ў трыццатых, праз беспрэцэдэнтныя курапатаўскія разнарадкі. Тым, хто застаўся ў жывых, давялося прайсьці праз жахлівую мясарубку Другой сусьветнай вайны і шматлікія «ўдарныя» штурмы пасьляваенных і пазьнейшых гадоў. «Прыстасоўвалі» людзей, «прыстасоўвалі» да новага жыцьця і самую прыроду... «Чаго ня здолелі вякі,/ Тут вырашылася ў паўгода,/ Ў казіны рог бальшавікі/ Сагнулі слуцкую прыроду...» — так з прыхаванай іроніяй сумна канстатаваў у свой час чарговую перамогу «новых гаспадароў жыцьця» паэт Алесь Дудар. Такі лёс быў падрыхтаваны ня толькі слуцкай прыродзе. Пазьней у выніку ўсё таго ж рэвалюцыйнага «добраўпарадкаваньня» нашай зямлі былі моцна параненыя «лёгкія Еўропы» – нашыя палескія балоты…

Безумоўна, бальшавізм спрабаваў сагнуць «у казіны рог» сам беларускі народ. І, што утойваць, яму гэта шмат у чым удалося..

А адно з самых істотных нашых «прыстасоўваньняў», бадай што, самае татальнае і страшнае, адбылося праз Чарнобыль, які быццам бы выпусьціў паветра з грудзей і так жорстка згвалтаванага і скалечанага фізічна і духоўна народу. Але і тое «прыстасаваньне», на жаль, стала не апошнім… Як вядома, на момант распаду СССР Беларусь з усіх рэспублік СССР мела ці не найлепшыя стартавыя ўмовы для будаўніцтва незалежнай краіны. І ўсё ж працавітая і цярплівая Беларусь ня стала па вялікім рахунку квітнеючай, як гэта, да прыкладу, здарылася потым з ушчэнт разьбітымі нашымі праціўнікамі па Другой сусьветнай...

Напэўна, большасьць з нас проста да нейкага часу не ўяўляла сабе маштабы нашых «перамогаў», якія ў выніку адкінулі нас не на дзясяткі, а на сотні (!) гадоў назад. Гэта стала асабліва відавочным, калі «жалезны занавес» з трэскам рухнуў, і многія з тых, хто меў вочы, змаглі ацаніць рэальную ступень нашага неверагоднага «росквіту»...

Пасьля развалу СССР у 1991 годзе ў нас шмат хто гаварыў пра канчатковую гібель ідэі сацыялізму на нашай зямлі. Але даволі хутка стала зразумелым, чуткі пра ягоную сьмерць былі крыху перабольшанымі. Ідэя, што лунала на сьцягах бальшавіцкай рэвалюцыі, ня згінула канчаткова разам з вялікай камуністычнай краінай. Ды і як магло быць інакш, калі нікуды ня зьніклі цэлыя пакаленьні тых, хто нарадзіўся, вырас, пасталеў пры ажыцьцяўленьні ленінскай «справы», тых, хто хоць і ня надта верыў у магчымасьць усеагульных роўнасьці і братэрства на зямлі, але добра памятаў пра «стабільную зарплату», «бясплатныя» адукацыю і медыцыну і шмат якія іншыя «даброты» сацыялістычнай сістэмы.

А даволі хутка высьветлілася, што найбольшая канцэтрацыя расьсяленьня такога кшталту людзей (дзякуючы, канешне, і пастаяннай вялікай міграцыі «лепшых сыноў» сістэмы на Беларусь) прыпадае якраз на «зямлю пад белымі крыламі». Менавіта ў нашай лясіста-балоцістай мясцовасьці (відаць, дзякуючы добрай яе ўвільготненасьці!) «справа» Леніна змагла пусьціць найбольш глыбокія карані. У выніку рэвалюцыйнага эксьперыменту нашая беларуская нацыя, на жаль, была найбольш грунтоўна «інфіцыравана» камунізмам. Мы і па сёньняшні дзень знаходзім у гэтай сваёй хваробе, як тая старэнькая вясковая Тэкля, нават нейкае мазахісцкае задавальненьне, усім пра яе распавядаючы і ўсім дэманструючы... Ды і як магло быць інакш, калі нашыя «пастыры» часоў незалежнасьці — «з аднаго выйшлі галіфэ» — з таго самага «рэвалюцыйнага», «камісарскага», незалежна ад іхніх сёньняшніх палітычных і партыйных поглядаў...

Уплыў «бесьсмяротнай» ленінскай справы выяўляецца ў нашым грамадстве

даволі выпукла. Толькі над намі пераможна лунае сёньня здабыты «ў бітвах за волю, у бітвах за долю» чырвона-зялёны «сьцяг перамог». Пра тое сьведчаць і захаваныя практычна ў нязьменнасьці камуністычныя герб і гімн, назвы тысячаў нашых вуліцаў, гарадоў, сёлаў, установаў, нашыя школьныя падручнікі, структура уладных інстытутаў, сацыяльная палітыка...

За многія гады нашага «раману» з рэвалюцыяй мы па сутнасці зрасьліся з ёю, сталі амаль «нарказалежнымі» ад яе духу, што сёньня бліскуча выяўляецца і ў самім нашым палітычным ладзе… Нездарма многія ў сьвеце называюць сёньня Беларусь «апошнім музеем сацыялізму пад адкрытым небам». І хай ня ўводзіць у зман адсутнасьць на новым-старым сьцягу бязьлітасна скрыўленага калісьці бальшавікамі крыжа — сярпа і молата, які яшчэ ў 1917 назвалі ў народзе сатанінскім. Калі ўважліва прыгледзецца, то ягоная выява ўсё ж «праступае» на ім, шчыра сімвалізуючы тую грамадскую сістэму, ствараемую за гады нашай незалежнасьці, яе духоўныя і маральныя імператывы...

* * *

Шчыра кажучы, я ня вельмі люблю слова «рэвалюцыя». Адчувае, відаць, мая душа ў вібрацыі гучаньня гэтага імені нейкую небясьпеку, відаць шмат у ягонай ауры нейкай цёмнай энергіі назапасілася. Так і хочацца вычысьціць гэтае слова з памяці свайго ўнутранага кампутару, каб і сьледу не засталося... Але потым разумею, што яно, гэтае самое слова, ні ў чым не вінаватае. Гэта мы, людзі, напаўняем вонкавую абалонку ўсялякага слова пэўным сэнсам, толькі мы маем уладу акумуляваць у ім як невымерную любоў і пяшчоту, так і бясконцую нянавісьць...

*Кастрычнік 2007*